вания. Каждый из нас создает свою проекцию в цифровое пространство, позиционируя себя тем или иным образом. Проблема цифровой идентичности достаточно сложна, и для описания одного конструкта может быть недостаточно. Таких конструктов может быть несколько, и существовать они могу параллельно, независимо друг от друга. На практике примером может служить у субъекта разделение личного, творческого, профессионального пространства. Для каждой из этих областей создается свой устойчивый образ-конструкт. Например, существуют интернет-платформы, где человек одновременно позиционирует себя как фотограф, как видеограф, как путешественник, как ремесленник, как поэт и т. д. И смешение этих областей недопустимо. В противном случае мы говорим уже о проблемах с самоидентификацией.

Ключевым моментом квазисоциального конструирования (дизайна) является процесс субъективного отождествления. Изображения, будучи основой образного восприятия, позволяют не только сделать определенное высказывание, но и описать свой «виртуальный социальный статус»: успешность, значимость, принадлежность и т. д. Отождествление себя с желаемым посредством фотографических изображений является современной социальной практикой.

## КАМУНІКАТЫЎНАЯ СТРАТЭГІЯ РЭГІЯНАЛЬНАЙ ПРЭСЫ Ў СТАНАЎЛЕННІ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ

***М. В. Прахарэня***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*marina.prohorenya@tut.by*

У артыкуле вызначаны канцэптуальныя асновы камунікатыўнай стратэгіі рэгіянальнай прэсы Беларусі ў фарміраванні грамадзянскай супольнасці. На аснове кантэнт-аналітычнага даследавання эмпірычнага матэрыялу вызначаны напрамкі камунікатыўнай стратэгіі рэгіянальнай прэсы ў фарміраванні грамадзянскай супольнасці. Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны ў працэсе далейшага вывучэння тэарэтыка-метадалагічнай канцэпцыі грамадзянскай супольнасці, у даследаванні праблем функцыянавання рэгіянальных друкаваных медыя.

***Ключавыя словы:*** рэгіянальная прэса; грамадзянская супольнасць; раённы друк; абласны друк; гарадская прэса; Мінская вобласць.

# COMMUNICATION STRATEGY OF THE REGIONAL PRESS IN THE DEVELOPMENT OF CIVIL SOCIETY

***M. V. Prakharenya***

*Belarussian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004 Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: M. V. Prakharenya (marina.prohorenya@tut.by)*

The article defines the conceptual foundations of communication Belarus regional press strategy in the formation of civil society. On the basis of content-analytical study of empirical data identified trends of communicative strategies of the regional press in the formation of civil society. The results can be used in the further study of theoretical and methodological concepts of civil society, in the study of problems of functioning of the regional print media.

***Keywords:*** regional press; civil society; district press; provincial press; city press; Minsk region.

Рэгіянальныя выданні – важнае звяно сацыяльных сувязей на месцы. Выступаючы як пасрэднік ці партнёр улады, дадзены сегмент медыяпрасторы спрыяе вырашэнню многіх надзённых праблем грамадзян. З’яўляючыся максімальна набліжаным да аўдыторыі, гэты сегмент СМІ здольны стаць платформай для грамадзянскай камунікацыі, павысіць палітычную актыўнасць насельніцтва, садзейнічаць станаўленню грамадзянскай супольнасці, выпрацоўваючы ўласную камунікатыўную стратэгію.

Для комплекснага асэнсавання канцэптуальных асноў камунікатыўнай стратэгіі і вылучэння яе прыярытэтных тэматычных кірункаў у працэсе фарміравання грамадзянскай супольнасці быў праведзены якасны і колькасны кантэнт-аналіз выданняў Мінскага рэгіёна – абласной газеты «Мінская праўда», раённай газеты «Слава працы» (Капыльскі раён), гарадской газеты «Жодзінскія навіны». Элементамі генеральнай сукупнасці сталі матэрыялы, якія выйшлі ў перыяд 1992–2017 гг. і адлюстроўваюць працэс фарміравання грамадзянскай супольнасці (усяго – 1184). Генеральная сукупнасць – кожны дзясяты нумар выданняў за пазначаны час.

Методыка кантэнт-аналізу дазволіла вылучыць устойлівыя тэматычныя кірункі, якія вызначаюць камунікатыўную стратэгію рэгіянальных выданняў у працэсе будаўніцтва грамадзянскай супольнасці.

Так, найбольшая колькасць публікацый прааналізаваных выданняў прысвечана *практычным мерапрыемствам па рэалізацыі сацыяльных стандартаў у адукацыйнай сферы, ахове здароўя і сацыяльных правоў грамадзян*. Рэгіянальныя СМІ нязменна суправаджаюць сацыяльную палітыку. Інфармуючы аб дзяржаўных мерапрыемствах у дадзеным кірунку, яны спрыяюць правядзенню сацыяльнай экспертызы, ацэнцы, прыняццю або непрыняццю захадаў дзяржавы, арганізуюць дыялог і зваротную сувязь паміж органамі ўлады і соцыумам. Масіў публікацый мясцовых СМІ на працягу доўгага часу планамерна паведамляе аб дзяржаўных мерапрыемствах і захадах па забеспячэнні высокага ўзроўню сацыяльнай бяспекі і абароны грамадства, функцыянаванні сістэмы адукацыі, аховы здароўя і інш.

Важным кірункам камунікатыўнай стратэгіі рэгіянальнага друку Рэспублікі Беларусь з'яўляецца *сцвярджэнне агульначалавечых каштоўнасцей і вартасцей*. У шматлікіх публікацыях мясцовых СМІ сцвярджаюцца такія каштоўнасці, як спагадлівасць і шчырасць, дабрыня ва ўзаемамадносінах паміж людзьмі, узаемапавага і дапамога. У цэнтры ўвагі рэгіянальнага друку найвышэйшая каштоўнасць – чалавек. Рубрыкі «Асоба», «Чалавек і яго справа», «Галерэя лёсаў», «Шчасце чалавека – вышэйшая мэта», «Расказы аб людзях харошых», «Твае героі, Міншчына», «Чалавек працай славіцца», «Нашы землякі» і інш. паказваюць аўтарытэт чалавека, яго вызначальную ролю ў грамадска-палітычным і эканамічным жыцці краіны.

Немалаважная роля рэгіянальных выданняў заключаецца ў пастуляванні *традыцыйных сямейных каштоўнасцей.* Сёння адбываецца значная актуалізацыя дадзенай тэматыкі. Сям'я – грунтоўны сацыяльны фундамент, дзе адбываецца фарміраванне асабістых якасцей чалавека, развіваюцца адказнасць, сумленнасць, павага, выхоўваюцца прыстойныя і этычныя паводзіны ў грамадстве.

Не менш значны кірунак камунікатыўнай стратэгіі рэгіянальнай прэсы – асвятленне *работы мясцовых органаў кіравання і самакіравання, электаральных кампаній* – г. зн. палітычнай сферы станаўлення грамадзянскай супольнасці. Мясцовае самакіраванне (лакальная дэмакратыя) з'яўляецца адной з найважнейшых форм, якая характарызуе развіццё грамадзянскай супольнасці. Праз мясцовае кіраванне і самакіраванне дзяржава ўзаемадзейнічае з грамадзянскай супольнасцю, якая выступае крыніцай легітымнасці ўладавых палітычных структур. Грамадзянская супольнасць не здольна без дзяржавы задаволіць значную частку сваіх патрабаванняў, а дзяржава без грамадзянскай супольнасці – стварыць эфектыўную дэмакратычную мадэль [1].

Найважнейшым палітычным інстытутам, які дазваляе грамадству выступаць у якасці рэальнай крыніцы ўлады, а грамадзянскай супольнасці – яе кантраляваць, з’яўляюцца *выбары*. Гэта адна з форм непасрэднай дэмакратыі, якая ўмацоўвае стандарты палітычнай культуры. Матэрыялы, дзе асвятляюцца падрыхтоўка і правядзенне электаральных кампаній, умацоўваюць аўтарытэт выбарчага права ў працэсе прыняцця палітычных рашэнняў, забяспечваюць шырокае прыцягненне людзей да пастаяннага ўдзелу ў палітычным жыцці краіны, да працы ў выбарных Саветах мясцовага і рэспубліканскага ўзроўняў і тым самым сцвярджаюць дэмакратычныя прававыя прынцыпы і свабоды – неад’емныя катэгорыі грамадзянскай супольнасці.

Фарміраванню светапогляду адказнага і ініцыятыўнага грамадзяніна садзейнічае камунікатыўная практыка рэгіянальных выданняў у асвятленні *пытанняў лакальнай гісторыі, краязнаўчая інфармацыя*. Кантэнт-аналіз выявіў актуальнасць дадзенага тэматычнага кірунку на старонках мясцовых СМІ. Менавіта гістарычная памяць, пазнанне мінулага служыць духоўнай асновай для будаўніцтва грамадзянскай супольнасці, умацоўвае і развівае нацыянальную самасвядомасць і годнасць, спрыяе вызначэнню месца народа ў агульнасусветнай прасторы.

Такім чынам, рэгіянальная прэса фарміруе ўласную камунікатыўную стратэгію, якая вызначаецца як сукупнасць тэматычнага напаўнення кантэнту, прадстаўленага ў адпаведных жанравых формах і накіраванага на арганізацыю дыялогу дзяржавы з грамадскасцю, рэпрэзентацыю працэсаў рэалізацыі сацыяльна-эканамічных стандартаў, захаванне гісторыка-культурнай спадчыны і ўмацаванне духоўна-маральных арыентацый і каштоўнасцей грамадства [2]. Гістарычныя традыцыі мясцовых выданняў грунтуюцца на прынцыпах свабоднага дэмакратычнага грамадства, дзе фарміруецца самадастатковая, законапаслухмяная асоба, максімальна ўключаная ў сацыяльнае жыццё, сцвярджаюцца правы і свабоды чалавека як абсалютныя каштоўнасці, забяспечваюцца публічнасць дзейнасці і інфармацыйная адкрытасць органаў улады. На наш погляд, усё гэта адпавядае асноўным задачам станаўлення грамадзянскай супольнасці.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Алексеева Т. А., Артемьева И. В., Худоренко Е. А. Основания гражданского общества: Хрестоматия. М. : Изд. центр ЕАОИ, 2007. 297 с.
2. Прахарэня М. В. Камунікатыўная стратэгія рэгіянальнай прэсы Беларусі ў фарміраванні грамадзянскай супольнасці : аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук : 10.01.10; Беларус. дзярж. ун-т. Мінск, 2018. 23 с.